ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
18
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 6 (1344)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА ПАСЯДЖЭННІ

спартыўна-аздараўленчай камісіі прафкома разглядалася пытанне аб паляпшэнні размеркавання і выдачы пуцёвак у міжвузаўскі прафілакторый. З канкрэтнымі прапановамі выступіла загадчыца універсітэцкай паліклінікі М. І. Цырульнікава. Затым быў зацверджаны план работы камісіі на 1982 год.

Н. ТУРОМША,
намеснік старшыні прафкома.

### СУСТРЭЧА СЛУХАЧОЎ

падрыхтоўчага аддзялення з калектывам супрацоўнікаў і студэнтаў філфака адбылася ў актавай зале факультэта. Намеснік дэкана М. М. Піпчанка расказаў аб дысцыплінах, з якімі сустрэнуцца студэнты на працягу навучання, пазнаёміў з саставам выкладчыкаў факультэта, яго кафедрамі. Ён пажадаў слухачам паспяхова здаць экзамены і ўліцца ў дружную студэнцкую сям'ю, актыўна ўдзельнічаць у мерапрыемствах, жыць жыццём і інтарэсамі факультэта. Потым выступілі дацэнт В. А. Захарава, студэнты факультэта, члены літаб'яднання «Узлёт».

В. ЧАРНЯЎСКІ,
слухач падрыхтоўчага аддзялення.

### У РАБОТУ

па прафарыентацыі ўключыліся супрацоўнікі і выкладчыкі амаль усіх падраздзяленняў універсітэта. Шэсць сярэдніх школ Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці наведаў выкладчык кафедры навуковага камунізму А. С. Церабаў, які пазнаёміў старшакласнікаў з нашай навучальнай установай. Акрамя таго, выступаючы ў раёна на нарадзе дырэктараў сярэдніх школ раёна, ён расказаў пра ўмовы прыёму ў БДУ.

Н. ЖУКАВА.

### З ГАСТРОЛЬНАЙ ПАЕЗДКІ

у Кішынёў вярнуўся універсітэцкі народны ансамбль танца «Крыжачок». Удзельнікаў ансамбля сардэчна прымалі іх калегі з народнага ансамбля песні і танца «Стругураш». З вялікім поспехам прайшлі канцэрты нашага самадзейнага калектыву ў Кішынёўскім дзяржаўным універсітэце і ў саўгасе «Янтарны».

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

## 23 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ

# НЕ ЗГАСНЕ СВЯТЛО ПОДЗВІГАЎ



БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ універсітэт імя У. І. Леніна завяршыў сваё станаўленне, калі першы Усесаюзны з'езд Саветаў зацвердзіў Дэкларацыю аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Яго гісторыя — яркае праяўленне дружбы народаў, непарушнага брацкага саюза ўсіх нацый і народнасцей. Маскоўскі, Петраградскі і Кіеўскі універсітэты аказалі новай вышэйшай навучальнай установе дапамогу навукова - педагагічнымі кадрамі. Наркамасветы РСФСР, Расійская Акадэмія навук і Цэнтральная кніжная палата — у камплектаванні бібліятэкі.

Адной з асаблівасцей універсітэта была яго цесная сувязь з Чырвонай Арміяй, брацкая дружба з камандзірамі, палітработнікамі і чырвонаармейцамі. Гэта і зразумела. У ліку студэнтаў, асабліва на рабочым факультэце, не знімаючы шынялёў, вучыліся звольненыя ў запас удзельнікі баёў за Савецкую ўладу, рабочыя і сяляне з ліку беднякоў. У тыя далёкія, стаўшыя гісторыяй гады нарадзілася традыцыя ваенна-шэфскай работы. Дарэчы ўспомніць, што першы рэктар БДУ прафесар У. І. Пічэта быў і першым старшынёй ваенна-шэфскай камісіі. Гісторыя універсітэта багатая прыкладамі праяўлення студэнтамі і выкладчыкамі адвагі і гераізму пры ўзброенай абароне Радзімы. А выхаванню гэтых высокіх маральных якасцей садзейнічала пастаянная дружба калектыву з воінамі Чырвонай Арміі.

Нам усім вядома, што праслаўлены савецкі палкаводзец Маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў быў выкладчыкам БДУ. Вось што расказвае адзін з музейных экспанатаў. Прафесар У. І. Пічэта звярнуўся да Георгія Канстанцінавіча, які ў тыя гады камандаваў 39-м Меляккеска-Пугачоўскім кавпалком, з просьбай дапамагчы знайсці выкладчыка для кафедры ваенна-дапрызыўнай падрыхтоўкі. Жукаў, падумаўшы, узяўся за гэту справу сам. З 1926 па 1931 год Георгій Канстанцінавіч умела сумяшчаў кіраўніцтва палком з выкладчыцкай работай. І хто ведае, у колькіх сваіх слухачоў абудзіў ён прагу да здзяйснення подзвігаў, гарачае жаданне абараняць інтарэсы Радзімы. Многім з іх выпаў затым гонар ваяваць пад кіраўніцтвам Г. К. Жукава.

Нямала было зроблена і шэфамі. Выкладчыкі і студэнты заўсёды з'яўляліся дарагімі і жаданымі гасцямі ў палку. Яны дапамагалі воінам засвойваць агульнаадукацыйныя прадметы, чыталі лекцыі і даклады, праводзілі вечары мастацкай самадзейнасці. За ўсё гэта Г. К. Жукаў ад імя асабістага саставу кавпалка падзякаваў калектыву БДУ ў прывітальнай тэлеграме, якая знаходзіцца ў музеі універсітэта...

Нельга без хвалявання глядзець на рэліквіі музея гісторыі універсітэта, прысвечаныя Я. В. Смушкевічу. Ён паступіў на вучобу ў БДУ ў 1923 годзе, калі быў палітруком 2-га атрада 4-й авіяэскадрыллі. На партрэце — юны палітработнік з валявым тварам, у гімнасцёрцы з «разгаворамі». Побач — студэнцкія дакументы палымянага савецкага патрыёта, камуніста з 1918 года, чыё жыццё і баявыя подзвігі авеяны легендамі.

Нягледзячы на вялікую занятасць па службе, ён аддаваў шмат сіл і часу вучобе. Я. В. Смушкевіч з'яўляўся прыкладам сабранасці і дысцыплінаванасці, прымаў актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. На факультэце грамадскіх навук у 1923—1924 гг. ён быў апорай маладой партыйнай арганізацыі.

Вось радкі з біяграфіі Якава Смушкевіча, якія адлюстроўваюць яго валявы характар, незвычайныя камандзірскія здольнасці. З 1922 года ў авіяцыі; камісар эскадрыллі, затым камісар авіябрыгады. З 1931 года камандзір і камісар 201-й авіябрыгады. Вызначыўся ў баях у саставе нацыянальна-рэвалюцыйных войск Іспаніі.

У тыя дні імя камдзіва Я. В. Смушкевіча, вядомага пад імем генерала Дугласа, грымела ў Іспаніі. Ён праявіў сябе цудоўным авіяцыйным военачальнікам, выдатным майстрам паветранага бою. За ўзорнае выкананне задання Савецкага ўрада Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 21 чэрвеня 1937 года ён быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

У час баёў на Халхін-Голе камкор Смушкевіч паспяхова кіраваў баявымі дзеяннямі нашай авіяцыі, за што ўдастоіўся другога медаля «Залатая Зорка».

Подзвігі! Яны быццам гучнае, незмаўкаючае рэха, гучаць над зямлёй, глыбока западаюць у сэрца. Мы расказалі толькі аб двух героях мінулых бітваў, якімі калектыў БДУ мае права ганарыцца. Аб выкладчыку і студэнце.

А іх было шмат, герояў, выхаванцаў нашай вышэйшай навучальнай установы. Калі пачалася Вялікая Айчынная, увесь шматтысячны калектыў універсітэта аб'явіў сябе мабілізаваным для адпору нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У першыя дні вайны 450 студэнтаў, аспірантаў, супрацоўнікаў і выкладчыкаў БДУ накіраваліся на фронт. Баявы шлях кожнага — гэта шлях палымянага патрыёта, адважнага абаронцы Радзімы.

Сотні кіламетраў прайшоў па франтавых дарогах былы студэнт Міхаіл Катлавец. Грозным для ворагаў быў танкавы батальён, якім ён камандаваў. Зімой 1944 года ў баі ў раёне Кіраваграда фашысты страцілі сем танкаў, шэсць разоў вымушаны былі адкатвацца назад, спрабуючы збіць батальён з пазіцый, якія ён займаў. У час прарыву абароны ворага на румына-венгерскай граніцы 5 кастрычніка 1944 года батальён знішчыў пяць гармат, больш за 100 павозак з боепрыпасамі, шмат жывой сілы праціўніка. У гэтым жорсткім баі М. П. Катлавец загінуў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 24 сакавіка 1945 года адважнаму воіну пасмяротна прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем названа вуліца ў горадзе Мазыры.

Дастойныя асобнага апісання баявыя справы былога кулямётчыка Д. П. Жмуроўскага.

Вясной 1944 года адважны воін разам з узводам у ліку першых пераправіўся праз раку Прут. Замацаваўшыся на беразе, кулямётчык стойка адбіваў контратакі праціўніка, і нават калі яго ранілі, не пакінуў поля бою. І такіх эпізодаў у ходзе мінулых бітваў у жыцці кулямётчыка было шмат. Цяпер Герой Савецкага Саюза Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі — прафесар, доктар гістарычных навук, працуе ў БДУ.

Адважным паветраным байцом зарэкамендаваў сябе ў гады мінулай вайны Мікалай Якаўлевіч Зайцаў, які лятаў на вядомых ІЛ-2. Камандзір экіпажа, а затым звяна, ён здзейсніў 185 баявых вылетаў, правёў 15 паветраных баёў, збіў 2 варожыя самалёты, знішчыў каля 20 танкаў, больш за 20 аўтамашын, 43 гарматы, 20 вагонаў з жывой сілай і тэхнікай.

У 1967 годзе Мікалай Якаўлевіч скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Зараз ён працуе старшым выкладчыкам кафедры філасофіі.

Выдатнай старонкай у гісторыі універсітэта стаў удзел у партызанскім руху. У жніўні 1941 года ўключыўся ў актыўную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі былы студэнт універсітэта Уладзімір Аляксандравіч Парахневіч. Пазней ён стаў Героем Савецкага Саюза.

У падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, выхаванні ў студэнцкай моладзі ідэйнай перакананасці, адданасці справе сацыялізму ёсць немалая доля працы і ветэранаў мінулых баёў. Сёння іх ва універсітэце 320 чалавек. Гэта вялікая сіла. Цяжка пераацаніць уздзеянне на моладзь іх выступленняў, расказаў аб героіцы Вялікай Айчыннай вайны.

Тры чвэрці з іх — камуністы. Кожны другі ветэран, які працуе зараз ва унівeрсітэце, уступіў у рады КПСС у гады Вялікай Айчыннай вайны, а пяць ветэранаў мінулых баёў маюць партыйны стаж звыш 50 гадоў.

Ветэраны універсітэта, як пяецца ў вядомай песні, не старэюць душой. Яны поўныя энергіі і паказваюць прыклад таго, як трэба авалодваць ведамі, штурмаваць вышыні навукі. 120 з іх маюць вучоныя званні і ступені, пяцёра выбраны членамі-карэспандэнтамі АН БССР, трынаццаць удастоены ганаровых званняў заслужаных работнікаў вышэйшай школы, дзеячаў навукі і тэхнікі.

Рыхтуючыся дастойнымі справамі сустрэць шасцідзесяцігоддзе ўтварэння СССР, мы зноў і зноў з гонарам успамінаем шляхі-дарогі франтавыя, воінскія подзвігі, якія здзейснены ў імя Радзімы. Прайшлі ўжо дзесяцігоддзі з дня пераможнага заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, а подзвігаў нязгаснае святло такое ж яркае, як Вечны агонь ля манумента на плошчы Перамогі.

Жывымі носьбітамі і палымянымі прапагандыстамі гераічных традыцый нашага народа, доблеснай Савецкай Арміі з'яўляюцца ўсе нашы ветэраны.

І. МАРЧАНКА,
палкоўнік у адстаўцы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, старшыня савета ветэранаў БДУ імя У. І. Леніна.

# ЗАВОЧНЫ ЗАПРАШАЕ НА



ЮРЫДЫЧНЫ факультэт рыхтуе па завочнай форме навучання кадры па спецыяльнасці правазнаўства. Тэрмін навучання 6 гадоў. На факультэт шляхам конкурснага адбору прымаюцца грамадзяне СССР без абмежавання ўзросту, якія маюць сярэднюю адукацыю і паспяхова здалі ўступныя экзамены. У першую чаргу залічваюцца асобы, характар работы якіх адпавядае спецыяльнасці правазнаўства або блізкай да яе, калі яны працуюць па

## ПРАВАЗНАЎСТВА

гэтай спецыяльнасці не менш шасці месяцаў; звольненыя ў запас ваеннаслужачыя; выпускнікі сярэдніх спецыяльных устаноў, якія рыхтуюць спецыялістаў з юрыдычнай адукацыяй. На астатнія месцы прымаюцца паступаючыя, характар работы якіх не адпавядае спецыяльнасці правазнаўства або якія маюць стаж па гэтай спецыяльнасці менш шасці месяцаў.

За час навучання студэнты атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па грамадскіх дысцыплінах: гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковаму камунізму. Студэнты глыбока вывучаюць спецыяльныя дысцыпліны, якія прадугледжвае вучэбны план па спецыяльнасці правазнаўства: тэорыю дзяржавы і права замежных краін, гісторыю дзяржавы і права СССР, савецкае дзяржаўнае права, дзяржаўнае права капіталістычных краін і краін, якія вызваліліся ад каланіяльнага прыгнёту, дзяржаўнае права сацыялістычных краін, савецкае адміністратыўнае права, савецкае будаўніцтва, суд і правасуддзе ў СССР, пракурорскі нагляд у СССР, асновы рымскага грамадзянскага права, савецкае грамадзянскае права, савецкае сямейнае права, савецкае зямельнае права і прававую ахову прыроды, савецкае працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння, калгаснае права, савецкае крымінальнае права, крыміналогію, савецкае выпраўленча-працоўнае права, савецкі крымінальны працэс, савецкі грамадзянскі працэс, крыміналістыку, міжнароднае права, псіхалогію (агульную і спецыяльную), судзебную статыстыку, асновы бухгалтарскага ўліку і судзебна-бухгалтарскай экспертызы, судзебную медыцыну, судзебную псіхалогію.

Падрыхтоўка спецыялістаў здзяйсняецца па трох спецыялізацыях: дзяржаўна-прававой, судзебна-пракурорска-следчай і гаспадарча-прававой. Па кожнай з гэтых спецыялізацый чытаюцца спецыяльныя курсы.

Выпускнікі дзяржаўна-прававой спецыялізацыі могуць працаваць у выканкомах мясцовых Саветаў народных дэпутатаў і ў органах дзяржаўнага кіравання, а судзебна-пракурорска-следчай — у органах юстыцыі, пракуратуры і МУС. Выпускнікі гаспадарча-прававой спецыялізацыі працуюць юрысконсультамі ў міністэрствах, ведамствах, вытворчых аб'яднаннях, на прадпрыемствах, ва ўстановах, арганізацыях.

На юрыдычным факультэце ёсць сем спецыяльных кафедр: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, грамадзянскага і сямейнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага права, крымінальнага працэсу, крыміналістыкі. Усе кафедры ўкамплектаваны высокакваліфікаванымі спецыялістамі. У іх ліку 8 дактароў юрыдычных навук і 42 кандыдаты юрыдычных навук.

Пры факультэце функцыяніруе аспірантура.

**В. ЧЫГІР,**
**дэкан юрыдычнага факультэта.**

## ФІЛАЛОГІІ



ФІЛАЛАГІЧНЫ факультэт запрашае на вучобу тых, хто любіць родную мову і літаратуру, хто хоча быць выкладчыкам беларускай і рускай моў і літаратуры ці выкладчыкам рускай мовы і літаратуры.

Адзін з самых старэйшых і буйнейшых ва універсітэце, філалагічны факультэт мае багатыя і слаўныя традыцыі ў навучанні і выхаванні творчай моладзі. Гэтыя традыцыі захоўвае і памнажае прафесарска-выкладчыцкі калектыў факультэта, у складзе якога зараз налічваецца 125 чалавек. Сярод іх вядомыя пісьменнікі, паэты, крытыкі, члены Саюза пісьменнікаў СССР і БССР.

Вучэбна-выхаваўчы працэс на завочным факультэце праводзяць тыя ж выкладчыкі, якія працуюць на стацыянары і вячэрнім аддзяленні. Яны дапамагаюць студэнтам-завочнікам набыць устойлівыя і багатыя веды па прадметах, якія вывучаюцца, авалодаць методыкай выкладання мовы і літаратуры, а таксама набыць навыкі самастойнай навукова-даследчай работы.

Студэнты-завочнікі вывучаюць тыя ж дысцыпліны вучэбнага плана і ў тым жа аб'ёме, што і студэнты стацыянара, толькі колькасць гадзін, адведзеных на іх вывучэнне, некалькі меншая.

Значнае месца ў вучэбным плане студэнтаў-завочнікаў адводзіцца прафесійнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Таму яны павінны авалодаць глыбокімі ведамі па сучаснай беларускай і рускай літаратуры, методыцы іх выкладання, стараславянскай мове, культуры мовы, рускай і беларускай дыялекталогіі, фальклору, тэорыі літаратуры, агульнаму мовазнаўству і інш.

Вялікае значэнне надаецца на факультэце вывучэнню грамадскіх дысцыплін, якія закліка1ы фарміраваць у студэнтаў марксісцка-ленінскі светапогляд і выхаваць актыўную жыццёвую пазіцыю. Гэта такія дысцыпліны, як гісторыя КПСС, навуковы камунізм, гісторыя СССР і БССР, марксісцка-ленінская філасофія і г. д. Акрамя гэтага, студэнты-філолагі вывучаюць лацінскую мову, замежныя мовы (англійскую, нямецкую, іспанскую, французскую), літаратуру народаў СССР і замежную літаратуру (літаратуру краін Еўропы, Азіі і Амерыкі), шэраг дысцыплін па спецыялізацыі, праходзяць вучэбна-педагагічную практыку.

Завочнікам чытаюцца лекцыі, праводзяцца з імі практычныя і семінарскія заняткі. Вучонымі факультэта створаны шэраг падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак для студэнтаў завочнай формы навучання.

Выкладчыкі даюць рэкамендацыі, як лепш арганізаваць самастойнае вывучэнне матэрыялу, як выконваць кантрольныя і курсавыя работы, як рыхтавацца да залікаў і экзаменаў. Гэта робіцца не толькі ў час правядзення залікова-экзаменацыйных сесій.

Штомесяц на факультэце праводзяцца дні завочніка, у час якіх можна атрымаць кваліфікаваную кансультацыю, датэрмінова здаць залік або экзамен, сустрэцца з кіраўніком курсавой або дыпломнай работы.

Шматгадовая практыка сведчыць аб тым, што выхаванцы завочнага факультэта з'яўляюцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі-філолагамі, якія носяць высокае і ганаровае званне настаўніка. Многія з выпускнікоў-завочнікаў сталі вядомымі вучонымі, дзеячамі культуры, пісьменнікамі.

**М. ПІПЧАНКА,**
**намеснік дэкана філалагічнага факультэта.**

## ЖУРНАЛІСТЫКІ

ФАКУЛЬТЭТ журналістыкі гасцінна расчыняе дзверы для тых, хто жадае стаць работнікам сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды.

За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў каля 3000 работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды. Многія выпускнікі сталі вядомымі партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі работнікамі, грамадскімі дзеячамі, вучонымі.

З кожным годам факультэт набірае сілу. Расце колькасць выкладчыкаў, павышаецца іх кваліфікацыя. Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база. Асабліва гэта прыкметна пасля пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў». Аб умацаванні факультэта сведчыць і тое, што калі ў пяцідзесятых гадах на факультэце дзейнічала толькі адна кафедра, то зараз іх чатыры: тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, гісторыі журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання.

Факультэт знаходзіцца ў прыгожым вучэбным корпусе. Тут ёсць радыё- і тэлестудыя, фоталабараторыя, клас машынапісу, вядзецца абсталяванне вучэбнай тыпалабараторыі.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў па эканамічных пытаннях. Таму ўводзяцца новыя курсы па вывучэнню актуальных праблем сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнаму прагрэсу, аналізу гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, комплекснай праграме ідэйнага выхавання і інш. Студэнты факультэта выпускаюць сваю вучэбную газету «Журналист» і альманах «Творчасць журналіста», працуюць у гуртках студэнцкага навуковага таварыства. Шмат цікавага даюць ім сустрэчы са старэйшымі калегамі па пяру, вучонымі, пісьменнікамі, артыстамі.



Чацвёрты год мы будзем набіраць на завочнае аддзяленне 75 чалавек (раней было 50). У першую чаргу пры ўмове паспяховай здачы ўступных экзаменаў будуць залічаны студэнтамі штатныя супрацоўнікі газет, радыё і тэлебачання.

Журналіст — гэта актыўны барацьбіт партыі. Ён павінен быць страсным чалавекам, глыбока разбірацца па ўсіх з'явах грамадскага жыцця, здольным да навуковага абагульнення і абгрунтаванага аналізу фактаў. Журналіст павінен валодаць добрым стылем, шмат ведаць, цікава і па-свойму пісаць.

У папулярнай песні пра журналіста ёсць словы: «Трое суток шагать, трое суток не спать ради нескольких строчек в газете...» Гэта вельмі ёмістае азначэнне журналісцкай работы; бо гэта нялёгкая, часам знясільваючая праца, аднак яна прыносіць ні з чым не параўнальнае маральнае задавальненне. Журналістыка — гэта пошук, нястомная барацьба за ідэалы нашага грамадства, за здзяйсненне партыйных рашэнняў, гэта неабходная ў наш час сувязь чалавека са здзіўляюча складаным і цікавым светам, у якім мы жывём.

**П. ТКАЧОЎ,**
**дэкан факультэта журналістыкі.**

## БІЯЛОГІІ

УСІХ, хто вырашыў удасканаліць свае веды ў цікавых і перспектыўных пытаннях біялогіі, запрашаем на наш факультэт. У цяперашні час біялагічны факультэт знаходзіцца ў новым высотным, прасторным і светлым будынку, дзе ёсць сучасныя аўдыторыі і лабараторыі.

Выпускнікі завочнага аддзялення біяфака паспяхова працуюць у сферы вытворчасці, навукі, у сярэдніх школах, тэхнікумах, універсітэтах і вышэйшых вучылішчах, у навукова-даследчых лабараторыях сельскагаспадарчага і медыка-біялагічнага профілю.

Падрыхтоўка спецыялістаў на завочным аддзяленні здзяйсняецца ўсімі васьмю кафедрамі факультэта: біяхіміі, батанікі, мікрабіялогіі, агульнай экалогіі, заалогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, дарвінізму і генетыкі, фізіялогіі раслін.

На першых трох курсах забяспечваецца агульнанавуковая і агульнапрафесійная падрыхтоўка. Першая здзяйсняецца шляхам вывучэння цыкла грамадскіх дысцыплін, неарганічнай, арганічнай, аналітычнай, фізічнай і калоіднай хіміі, вышэйшай матэматыкі, фізікі, варыяцыйнай статыстыкі, замежнай мовы, другая — вывучэннем заалогіі, марфалогіі і сістэматыкі раслін, мікрабіялогіі, біяхіміі, анатоміі, генетыкі і дарвінізму, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл і інш.

Спецыфіка завочнай формы навучання праяўляецца ў падрыхтоўцы спецыялістаў у двух напрамках. З аднаго боку, студэнты павышаюць узровень біялагічных ведаў і прафесійнае майстэрства, вучачца біялогіі і хіміі праз навучанне педагогіцы, псіхалогіі, методыцы выкладання біялогіі і хіміі, праходжанне і абмеркаванне школьнай практыкі, а таксама вывучэн-

# ФАКУЛЬТЭТ АДДЗЯЛЕННІ:

КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ і Савецкі ўрад заўсёды аддавалі і аддаюць вялікую ўвагу падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй без адрыву ад вытворчасці. Завочная форма навучання—зручны шлях павышэння кваліфікацыі для тых, хто працуе па выбранай спецыяльнасці, і добрая магчымасць набыць новую спецыяльнасць.



## ГІСТОРЫІ

На аддзяленні гісторыі завочнага факультэта ў цяперашні час навучаецца 800 студэнтаў. Ідзе падрыхтоўка гісторыкаў, выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства для агульнаадукацыйных школ і сярэдніх спецыяльных устаноў. Многія выпускнікі аддзялення гісторыі працуюць экскурсаводамі ў экскурсійных і турысцкіх арганізацыях, навуковымі супрацоўнікамі архіваў, музеяў і навукова-даследчых інстытутаў, у партыйных, савецкіх і камсамольскіх органах.

Вучэбны план для завочнікаў разлічаны на 6 гадоў навучання. Па свайму зместу ён амаль не адрозніваецца ад вучэбнага плана стацыянара. Два разы ў год (у студзені і ў ліпені) студэнты-завочнікі збіраюцца на сесіі. У гэты час яны слухаюць лекцыі, наведваюць семінарскія і практычныя заняткі, атрымліваюць кансультацыі у выкладчыкаў, здаюць залікі і экзамены. У перыяд паміж сесіямі студэнты-завочнікі выконваюць кантрольныя і курсавыя работы, самастойна рыхтуюцца да экзаменацыйных сесій. Здаваць экзамены дазваляецца і ў дні завочніка.

Пачынаючы з 4-га курса студэнты размяркоўваюцца згодна са сваімі інтарэсамі па групах спецыялізацый для больш паглыбленага вывучэння аднаго з напрамкаў гістарычнай навукі. На аддзяленні гісторыі завочнага факультэта студэнты могуць спецыялізавацца па гісторыі КПСС, гісторыі СССР, гісторыі БССР, усеагульнай гісторыі, археалогіі і этнаграфіі. Кожная спецыялізацыя здзяйсняецца сіламі адной ці дзвюх кафедр, супрацоўнікі якіх чытаюць спецыяльныя лекцыйныя курсы, праводзяць спецсемінары па найбольш актуальных пытаннях гісторыі. У рамках спецыялізацыі студэнты падбіраюць тэмы сваіх курсавых і дыпломных работ.

На аддзяленні гісторыі завочнага факультэта ў цяперашні час працуе аўтарытэтны калектыў выкладчыкаў, сярод якіх 9 дактароў гістарычных навук, дацэнтаў. 10 дактароў навук працуюць на кафедрах грамадскіх навук універсітэта, якія таксама вядуць заняткі са студэнтамі-завочнікамі. Высокі навуковы патэнцыял, вялікі вопыт вучэбна-метадычнай работы прафесарска-выкладчыцкага калектыву гістарычнага факультэта дазваляе паспяхова весці падрыхтоўку кадраў беларускіх савецкіх гісторыкаў.

Студэнты аддзялення гісторыі завочнага факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце і навуковым жыцці універсітэта. Штогод дзесяткі студэнтаў-завочнікаў выступаюць на студэнцкіх навуковых канферэнцыях. Многія з іх прымаюць удзел і дабіваюцца высокіх вынікаў на рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

**І. ЦАРУК,**
**дэкан гістарычнага факультэта.**



## ГЕАГРАФІІ

ГЕАГРАФІЧНЫ факультэт—вядучы цэнтр падрыхтоўкі кадраў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы па геаграфіі ў Беларусі. Геаграфічная адукацыя ва універсітэце вызначаецца шырокім дыяпазонам ведаў, таму выпускнікоў факультэта можна сустрэць у школах, навукова-даследчых, праектных і вытворчых установах і арганізацыях прыродазнаўчага, эканамічнага і краязнаўчага профілю.

У саставе факультэта сем кафедр і дзве лабараторыі: праблемная навукова-даследчая лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і галіновая лабараторыя возеразнаўства.

Студэнты завочнага факультэта набываюць спецыялізацыю фізічная ці эканамічная геаграфія. Таксама, як і студэнты дзённага і вячэрняга аддзялення, яны вывучаюць грамадскія, агульнаадукацыйныя і геаграфічныя дысцыпліны, слухаюць лекцыі па агульнай геалогіі, глебазнаўству і геаграфіі глебы, метэаралогіі і кліматалогіі, гідралогіі, біягеаграфіі, геадэзіі і картаграфіі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, эканамічнай геаграфіі замежных краін, агульнай тапаніміцы, геаграфіі БССР, гісторыі і метадалогіі геаграфічнай навукі і інш.

Акрамя таго, фізіка-географы вывучаюць геахімію і геафізіку ландшафтаў, фізіка-геаграфічнае раяніраванне і карціраванне, агракліматалогію і іншыя спецыяльныя дысцыпліны. Сярод спецкурсаў, якія чытаюць для эканоміка-географаў,—эканамічная геаграфія, асновы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, эканамічнае раяніраванне, статыстыка, раённая планіроўка.

Важным відам грамадскай дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў з'яўляюцца вучэбныя і вытворчыя практыкі. Сіламі выкладчыкаў і студэнтаў факультэта створана вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Беразіна»—месца праходжання ўсіх відаў вучэбнай практыкі. Тут ёсць тры карпусы інтэрнатаў, вучэбныя пакоі, клуб, сталовая, спартыўная пляцоўка, лабараторыя. У час вучэбных практык студэнты праводзяць тапаграфічныя здымкі мясцовасці, вывучаюць геалагічныя працэсы, глебы, вызначаюць форму і памеры ўзвышшаў, нізін, іх прыроду, вядуць назіранні за надвор'ем і г. д. Заключным этапам з'яўляецца геаграфічная практыка, якая ўключае комплексную характарыстыку прыродных умоў, насельніцтва і гаспадаркі раёна.

Вытворчая практыка студэнтаў-завочнікаў звязваецца, як правіла, з месцам і характарам іх работы. Па матэрыялах вытворчай практыкі пішуцца курсавыя і дыпломныя работы. Як і студэнты дзённага навучання, завочнікі прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце, выступаюць з навуковымі паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях гурткоў, канферэнцыях, прадстаўляюць работы на рэспубліканскі агляд-конкурс.

У час вучобы завочнікі карыстаюцца літаратурай і вучэбнымі дапаможнікамі бібліятэкі універсітэта і кабінетаў пры кафедрах. Для іх ёсць метадычныя дапаможнікі і распрацоўкі па асобных прадметах. Высокі навукова-метадычны ўзровень лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў, групавыя і індывідуальныя кансультацыі, гутаркі ў міжсесійны перыяд і дні завочнікаў, неабходная дапамога і кантроль за арганізацыяй самастойнай работы садзейнічаюць падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

**М. РАМАНОЎСКІ,**
**дэкан геаграфічнага факультэта.**



не шэрагу біялагічных дысцыплін па агульнапрафесійнай падрыхтоўцы, з другога—набываюць тэарэтычныя і практычныя веды работнікаў біялагічных і медыка-біялагічных устаноў.

Значную ролю ў падрыхтоўцы спецыяліста-біёлага адыгрываюць летнія вучэбныя практыкі, якія праводзяцца на біястанцыях. Вялікая роля і вучэбна-вытворчых практык.

Спецыялізацыя студэнтаў-завочнікаў пачынаецца з IV курса і забяспечваецца чытаннем шэрагу спецкурсаў кафедрамі факультэта, выкананнем дзвюх курсавых работ, якія павінны змяшчаць элементы навуковай работы. За час выканання курсавых работ студэнты засвойваюць сучасныя метады эксперыментальнай работы. Паспяховае выкананне курсавых работ з'яўляецца асновай для напісання дыпломнай работы.

Кафедры факультэта стараюцца максімальна наблізіць спецыялізацыю студэнтаў да іх асноўнай работы. Гэта забяспечваецца тым, што студэнтам, якія працуюць у педагагічных установах, прапануюцца тэмы педагагічнага напрамку, а студэнтам, якія працуюць у навуковых установах,—тэмы, блізкія да іх работы. Студэнты-завочнікі прыцягваюцца да выканання і навуковых работ кафедры. Паказчык сур'ёзных дасягненняў навуковай работы студэнтаў-завочнікаў — удзел у многіх рэспубліканскіх конкурсах навуковых студэнцкіх работ, у навуковых канферэнцыях.

**А. ШУКАНАЎ,**
**дэкан біялагічнага факультэта.**



## ФІЛАСОФІІ

НА АДДЗЯЛЕННІ філасофіі завочнага факультэта навучаецца каля 300 студэнтаў. Яны атрымліваюць шырокую грамадскую адукацыю, вывучаюць шэраг філасофскіх дысцыплін, марксісцка-ленінскую метадалогію, гісторыю культуры, этыку, эстэтыку і г. д. Працэс духоўнага развіцця розных краін, усяго чалавецтва раскрываецца пры вывучэнні курсаў гісторыі філасофіі, пачынаючы са старажытных часоў і да нашых дзён. Кожнае новае пакаленне філосафаў, спасцігаючы агульныя законы развіцця прыроды, грамадства і мыслення, шукае адказы на пытанні аб паходжанні свету, аб адносінах паміж быццём і свядомасцю, узбройваецца дыялектычным метадам пазнання. У вучэбны план уключаны таксама асновы вышэйшай матэматыкі, фізікі, біялогіі і іншых прыродазнаўчых дысцыплін. Пачынаючы з 4 курса прадугледжваецца спецыялізацыя студэнтаў па дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму, а таксама па этыцы і навуковаму атэізму.

Усебаковая гуманітарная адукацыя, высокая ідэйна-тэарэтычная падрыхтоўка робяць выпускнікоў-філосафаў спецыялістамі шырокага профілю. Выпускнікі аддзялення працуюць выкладчыкамі філасофіі, грамадазнаўства, этыкі, эстэтыкі ў прафесійна-тэхнічных вучылішчах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, сацыёлагамі на прадпрыемствах і ва ўстановах, у савецкім, партыйным і камсамольскім апараце.

Навучальны працэс на аддзяленні забяспечваюць супрацоўнікі кафедр марксісцка-ленінскай філасофіі, гісторыі філасофіі і логікі, навуковага камунізму, этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, палітычнай эканоміі.

**П. ШУПЛЯК,**
**намеснік дэкана гістарычнага факультэта.**

# ЧАРГОВЫ КРОК

**КЛАСІЧНАЯ БАРАЦЬБА**



МІМА ГЭТЫХ дзвярэй нельга прайсці спакойна. Шум, узбуджаныя галасы. І толькі потым можна заўважыць аб'яву, што тут, на першым паверсе геаграфічнага корпуса, дзейнічаюць універсітэцкія секцыі спартыўнай барацьбы.

Хто з юнакоў у дзяцінстве не марыў стаць волатам, як Паддубны, як Аляксандр Мядзведзь?! Штодзённа гэтыя дзверы з хваляваннем адчыняюць дзесяткі школьнікаў, студэнтаў-разраднікаў, майстроў спорту — членаў зборных рэспублікі.

Сёння трэніруюцца «класікі». Пятнаццаць гадоў узначальвае секцыю класічнай барацьбы Віктар Аляксандравіч Рудзянкоў. Ён прыйшоў сюды адразу пасля заканчэння інстытута фізкультуры. Напружаныя паядынкі, уласныя чэмпіёнскія перамогі для яго ўжо ў мінулым. Прыходзяць да трэнера навічкі-першакурснікі, пакідаюць вопытныя майстры спорту. А ён застаецца. Гэта яго штодзённая праца. Гэта яго вялікі спорт.

Я паспеў к самаму пачатку. Размінка. Хлопцы бегаюць па крузе, робяць скачкі. У іх упэўненыя, вывераныя рухі. Размінка заканчваецца. Пачынаецца праца. Так, тут кажуць іменна «працаваць». Настойліва і працягла. Над адным і тым жа прыёмам. А ў час адказных паядынкаў гэта праца над сабой ператвараецца ў пераможныя ачкі.

— Валянцін, Віктар! На цэнтр! — коратка загадвае Рубянкоў.

Юнакі выходзяць на маты. Астатнія стаяць побач, уважліва назіраюць, слухаюць парады трэнера. Затым пачынаецца паядынак. Імгненне, і адзін з сапернікаў ужо прыціснуты лапаткамі да барцоўскага дывана. Сотыя долі секунды — і надзейны фотаапарат не паспявае зафіксіраваць патрэбны мне момант. Кідок, яшчэ кідок! Прайшлі яшчэ хвіліны, а на тварах юнакоў пот. Толькі не падумайце, што гэта стома.

— Валянцін Карканіца і Віктар Сапун—кандыдаты ў майстры спорту,—расказвае Віктар Аляксандравіч. — Валянцін — трэцякурснік геафака, Віктар — малады супрацоўнік. А ўсяго секцыю наведваюць 44 студэнты і супрацоўнікі. Пяць майстроў спорту. Многія спартсмены— члены юнацкіх і дарослых зборных рэспублікі, чэмпіёны і прызёры чэмпіянатаў. У даны момант, напрыклад, тут не прысутнічае член зборнай рэспублікі Алег Харапека. Адсутнічаюць таксама блізняты-першакурснікі Вадзім і Святаслаў Каршалі. Абодва — кандыдаты ў майстры спорту. Вадзім — чэмпіён рэспублікі сярод юнакоў у сваёй вагавой катэгорыі. Хутка каманда універсітэта прыме ўдзел у першынстве сярод ВНУ рэспублікі. У мяне шмат падстаў чакаць ад сваіх выхаванцаў пераможных вынікаў.



Юнакі, не спяшаючыся, апранаюцца, развітваюцца. Апошнім з залы выходзіць трэнер. Заўтра ён зноў збярэ сваіх выхаванцаў. Заўтра — чарговая трэніроўка, і яны—і трэнер, і спартсмены — зробяць чарговы крок да перамогі.

**В. ШАЧАК.**
Фота **аўтара.**

# І ЗНОЎ ПЕРАМОГА

У ПЕРШЫНСТВЕ універсітэта па класічнай барацьбе прынялі ўдзел 63 спартсмены. Сярод іх быў 1 майстар спорту СССР, 6 кандыдатаў у майстры спорту СССР, 9 першаразраднікаў.

У выніку двухдзённых спаборніцтваў першае месца, як і ў мінулым годзе, заняла каманда юрыдычнага факультэта. У асабістым першынстве паспяхова выступіў майстар спорту СССР, капітан каманды юрфака і зборнай універсітэта Мікалай Рубіс, якому не было роўных у цяжкай вагавой катэгорыі. Радуе, што два першыя месцы занялі першакурснікі Ігар Аносаў (гістфак) і Сяргей Байда (юрфак).

Барацьба на турніры была ўпартай — аб гэтым сведчыць той факт, што фізічны факультэт прайграў юрфаку ўсяго тры ачкі. На першае месца трымала кірунак і каманда геаграфічнага факультэта. Тры яе спартсмены сталі чэмпіёнамі. Але падвёў Г. Ждановіч, які не з'явіўся на спаборніцтвы. Прыйшлося задаволіцца толькі трэцім месцам.

Астатнія факультэты значна ўступілі лідэрам.

Прыходзіцца здзіўляцца, што не ўсе факультэты выставілі каманды. Не было барцоў з ФПМ, журфака, біяфака, філфака. А хімфак быў прадстаўлены ўсяго адным спартсменам. Гэта сведчыць аб тым, што на пералічаных факультэтах удзяляецца мала ўвагі класічнай барацьбе.

**В. РУДЗЯНКОЎ,**
**галоўны суддзя турніра.**

# НЕ ТОЛЬКІ МАЙСТЭРСТВА

ПЕРШЫНСТВО БДУ па валейболу паказала, што ў дасягненні высокіх вынікаў немалаважна выдатная дысцыплінаванасць усіх членаў факультэцкіх каманд.

Давайце паглядзім на табліцы. У мужчын месцы размеркаваліся так: **1 — фізфак; 2— мехмат; 3—радыёфізікі і электронікі; 4 — гістфак; 5 — хімфак; 6 — біяфак; 7 — геафак; 8 — юрфак; 9— ФПМ; 10 — журфак; 11 — філфак.** У дзяўчат становішча некалькі іншае: **1 — хімфак; 2 — ФПМ; 3 — мехмат; 4 — фізфак; 5 — юрфак; 6 — біяфак; 7 — філфак; 8 — журфак; 9 — радыёфізікі і электронікі; 10 — геафак.**

Увогуле гульня каманд, акрамя дзвюх першых у дзяўчат, не вельмі задавальняла. Неяк прымітыўна дзейнічалі валейбалісткі, няшмат было тэхнічных прыёмаў. Крыху лепш выглядалі юнакі. Яны прымянялі больш тэхнічных прыёмаў, тэмп гульні быў больш хуткім. Але вызначыць самую лепшую каманду нельга. Усе былі падобныя адна на адну. Узровень іх гульні яшчэ далёкі да ўзорнага. Не сакрэт, што ў многім ён залежыць ад дысцыплінаванасці каманд.

У мужчын амаль усе спартсмены добрасумленна аднесліся да правядзення сустрэч. Гэтага не хапала дзяўчатам. Напрыклад, каманда журфака нядрэнна правяла ўсе сустрэчы. Яна прэтэндавала на першае месца ў другой групе. Але на рашаючы матч з біяфакам спазнілася адна валейбалістка, запасных таксама не было, і камандзе залічана паражэнне.

А вось дзяўчатам з філфака іменна арганізаванасць дапамагла ўзняцца на чатыры прыступкі ўверх у параўнанні з мінулым годам. Добрай дысцыплінаванасцю вызначыліся каманды фізфака, хімфака, біяфака.

Я не выпадкова не назваў у табліцы жаночую каманду гістарычнага факультэта, якая лічыцца адной з мацнейшых і ў мінулы раз была другой. Цяпер яе знялі са спаборніцтваў з-за парушэння дысцыпліны. Каманда двойчы не з'явілася на матчы. Капітан яе, студэнтка II курса Ірына Саракун, абыякава аднеслася да сваіх абавязкаў. І ўся віна за няўдачу ляжыць перш за ўсё на ёй.

**М. КУЧЫНСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**



**Закончыліся спаборніцтвы сярод факультэтаў па шахматах. Першае месца заняла каманда ФПМ. Наступныя месцы размеркаваліся так: мехмат, хімфак, юрфак, журфак, геафак. Каманда філфака знята са спаборніцтваў за няяўку на матч.**
**НА ЗДЫМКУ: адзін з момантаў першынства па шахматах.**

**ДЗЮ-ДО**

# Прадстаўляем чэмпіёнаў

**С. АШУРАЎ (юрфак)** — да 60 кг;
**В. ДУДНІК (юрфак)** — да 65 кг;
**А. ЮЗАФЯРОВІЧ (юрфак)** — да 71 кг;
**П. ГАПАТЧАНКА (біяфак)** — да 78 кг;
**М. БАЙКОЎСКІ (юрфак)** — да 86 кг;
**У. МАТАРАС (юрфак)** — да 95 кг.;
**Г. ПАШЫК (геафак)** — звыш 95 кг.

У камандным першынстве па дзю-до факультэты размясціліся наступным чынам: юрфак, біяфак, хімфак, мехмат, фізфак, радыёфізікі і электронікі, геафак, гістфак, ФПМ.

Каманды журфака і філфака не ўдзельнічалі ў спаборніцтвах.

**ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА**

# НЕЗАПОЎНЕНЫЯ КЛЕТКІ

КАЛІ АНАЛІЗУЕШ судзейскія пратаколы першынства БДУ па лёгкай атлетыцы, то заўважаеш ужо традыцыйна звыклае размяшчэнне каманд. Спачатку ідзе механіка-матэматычны факультэт —345 ачкоў. Ад яго намнога адсталі астатнія факультэты. У гістфака 235 ачкоў, юрфака — 213. Затым ФПМ — 167,5, радыёфізічны — 160. У канцы турнірнай табліцы знаходзяцца філфак — 82, хімфак — 71, біяфак — 63,5. І апошні — журфак, у якога ўсяго 19,5 ачка.

Паўтаруся — такое становішча стала ўжо традыцыйным. Праўда, умацаваў свае лідэрства мехмат. Зборная ММФ была самай буйнай па колькаснаму саставу. Мехмат выйграў абедзве эстафеты. Студэнтка факультэта Т. Крупянкова перамагла ў бегу на 60 метраў. С. Багданчук заняў першае месца на дыстанцыі 300 метраў. Чэмпіёнам універсітэта і спартакіяды ў кіданні кап'я стала Л. Кунчук.

Значна здаў свае пазіцыі фізфак. У мінулым годзе ён заняў другое месца з 218,5 ачка. Замацаваўся апошнім журфак, у якога, акрамя трэцяга месца ў кіданні дыска сярод мужчын, высокіх вынікаў няма. Па-ранейшаму не вельмі паспяхова выступаюць хімфак, біяфак, філфак. Але філолагаў трэба адзначыць. Нарэшце паявіліся добрыя лёгкаатлеты і ў іх. Так, Н. Бяжок заняла першае месца ў скачках у даўжыню і трэцяе ў бегу на 60 метраў.

Увогуле рэзультаты лёгкаатлетаў не радуюць. Можна адзначыць вынікі ў бегу на 60 метраў. В. Лунёў (гістфак) і Д. Гілевіч (біяфак) пераадолелі дыстанцыю за 6,8 секунды. Усяго 5 сантыметраў не хапіла В. Маслаўскаму (радыёфізічны), каб паўтарыць рэкорд універсітэта ў скачках у вышыню. Але яго рэзультат — 2 метры — заслугоўвае ўвагі.

На жаль, многія спартсмены не з'явіліся на спаборніцтвы, хаця былі заяўлены. Так, у бегу на 300 метраў сярод мужчын было заяўлена звыш 30 чалавек, а беглі толькі 14. У дзяўчат 16 чалавек не з'явіліся. У кіданні кап'я ў жанчын не аказалася трэцяга прызёра. Не здзіўляйцеся, спартсменка не адмовілася ад прызоў, проста больш удзельнікаў не было, хаця ў спісе значылася іх пяць.

Хтосьці з суддзяў сказаў: «Нам менш працы». А для факультэтаў — гэта страчаныя ачкі.

Час правядзення першынства — канец снежня — быў выбраны няўдала. Гэта пара апошніх заняткаў, напружанай працы. Пажадана першынство па лёгкай атлетыцы праводзіць у лютым, калі няма такой напружанасці ў студэнцкім жыцці. Тады б у судзейскіх пратаколах не заставаліся незапоўнёнымі многія клеткі.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
18 лютага 1982 г.
АТ 21132 Заказ 331.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ